Слаўся, Айчына ты наша свабодная!

Голас Радзімы

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАЙ СЕКЦЫІ КАМІТЭТА ЗА ВЯРТАННЕ НА РАДЗІМУ І РАЗВІЦЦЕ КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЕЙ З СУАЙЧЫННІКАМІ

№ 94 (579) | Снежань 1961 г. | Год выдання 7-ы

Вярхоўны Савет СССР накрэсліў план 4-га года сямігодкі

У гэтыя дні ў Маскве адбывалася VII сесія Вярхоўнага Савета СССР. Яна праходзіла пад знакам усенароднай барацьбы за здзяйсненне велічных прадвызначэнняў XXII з'езда Камуністычнай партыі. Пасланцы народа прывезлі сюды радасныя навіны аб тым, як дружна савецкі народ пачаў ажыццяўляць Праграму КПСС, які творчы энтузіязм і натхненне пануюць паўсюды, як уладна крочыць па нашай зямлі сямігодка.

Выдатнымі справамі заканчваецца трэці год сямігодкі.

Валавая прадукцыя прамысловасці ў гэтым годзе будзе на 33 працэнты вышэй за ўзровень 1958 года, або на 6 працэнтаў больш прадугледжанага сямігадовым планам. Па сямігадоваму плану на першыя тры гады намячаўся сярэднегадавы прырост прамысловай прадукцыі на 8,3 працэнта, а фактычна за гэты час ён складзе 10 працэнтаў. Значна апярэдзіла заданне трох гадоў сямігодкі і прамысловасць нашай рэспублікі.

Хуткімі тэмпамі ідзе ўгору цяжкая прамысловасць Савецкага Саюза. У гэтым годзе агульны аб'ём яе прадукцыі ўзрасце больш чым на 10 працэнтаў. Расшырыўся выпуск прадметаў народнага ўжытку. Далейшага росту вытворчасці прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі дабіліся калгасы і саўгасы. Ажыццёўлены буйныя мерапрыемствы па ўкараненню высокапрадукцыйнай тэхнікі і перадавой тэхналогіі ва ўсе галіны народнай гаспадаркі.

Чацвёрты год сямігодкі прынясе яшчэ большыя здабыткі. У народнагаспадарчым плане наступнага года прадугледжваецца далейшае павышэнне эканамічнай магутнасці СССР, забеспячэнне высокіх тэмпаў развіцця цяжкай індустрыі, далейшае ўмацаванне абароназдольнасці краіны, паскоранае развіццё сельскай гаспадаркі, значнае расшырэнне вытворчасці прадметаў народнага ўжытку, няўхільнае павышэнне жыццёвага ўзроўню народа.

У 1962 годзе намячаецца павялічыць агульны аб'ём прамысловай прадукцыі на 8,1 працэнта, вытворчасць сродкаў вытворчасці (група «А») — на 8,8 працэнта. Прадугледжваецца пры гэтым фарсіраваны рост вытворчасці сродкаў вытворчасці, прызначаных для лёгкай, харчовай прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Выпуск тавараў народнага ўжытку павялічыцца на 6,6 працэнта. Капітальныя ўкладанні на развіццё лёгкай прамысловасці ў наступным годзе павялічацца на 33,5 працэнта супраць узроўню гэтага года.

На 19 працэнтаў больш у параўнанні з сёлетнім годам узрасце аб'ём дзяржаўных капітальных укладанняў у сельскую гаспадарку. Калгасам і саўгасам будзе пастаўлена 216 тысяч трактараў, 144 тысячы розных уборачных камбайнаў і іншая тэхніка. Усё гэта будзе садзейнічаць далейшаму крутому ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці, паспяховаму выкананню сямігадовага плана ў галіне сельскай гаспадаркі.

Значна павысіцца ў чацвёртым годзе сямігодкі матэрыяльны дабрабыт і культурны ўзровень жыцця савецкага народа. Нацыянальны даход павялічыцца на 8,6 працэнта. Узрасце фонд заработнай платы. Павялічацца маштабы жыллёвага будаўніцтва. Расшырыцца задавальненне патрэб працоўных за кошт грамадскіх фондаў.

Планам прадугледжваецца хуткае развіццё народнай гаспадаркі ўсіх саюзных рэспублік. Беларускі народ, як і ўсе савецкія людзі, узброены гістарычнымі рашэннямі XXII з'езда КПСС, натхнёна працуе на заводах, фабрыках, у калгасах, саўгасах. Вялікія планы чацвёртага года сямігодкі, якія абмеркаваў Вярхоўны Савет СССР, клічуць працоўных на новыя здзяйсненні ў імя поўнай перамогі камунізма.

Ганаруся маім народам

Ліст з Бразіліі

Шматпаважаныя Камітэт і рэдакцыя «Голасу Радзімы»!

Паведамляю, што я атрымаў ад вас найкаштоўнейшы падарунак: другі том рамана «Сокі цаліны», двухтомнік Пімена Панчанкі, аповесць «Людзі асобага складу» і альбом «Мінск».

Дарагая рэдакцыя! Сардэчна прашу, калі магчыма, напішыце ў газеце пра маю неабсяжную радасць ад гэтай пасылкі. Наш гарадок Жандая невялікі — 25 тысяч насельніцтва, і тут не так многа адукаваных людзей. І кожны, хто бачыў гэту пасылку, вельмі здзіўляўся, што мне адразу прыслалі столькі кніг. Усе з цікавасцю разглядалі іх. Я быў, як у гарачцы, разгортваў, паказваў іх усім.

Я ганарыўся і ганаруся маім народам і маёй Радзімай, і мне ёсць чым ганарыцца. Фатаграфію Гагарына я паставіў замест іконы.

УВЕСЬ СВЕТ ПЕРАГНАЛА ДАРАГАЯ МАЯ РАДЗІМА!

Жадаю шчасця і поспехаў у захаванні сусветнага міру і шчаслівага, вясёлага жыцця маім суайчыннікам-беларусам.

Бразілія. *Антон МІКША.*



ГАРАДЗІШЧА Брэсцкай вобласці. Нядаўна тут здадзены ў эксплуатацыю медыцынскі гарадок: бальніца на 115 ложкаў з радзільным аддзяленнем, інфекцыйнае аддзяленне, паліклініка і шматлікія дапаможныя памяшканні. У паліклініцы працуюць тэрапеўтычны, хірургічны, вочны, кішэчны, неўралагічны, фізіятэрапеўтычны і многія іншыя кабінеты. У бальніцы і паліклініцы навейшае медыцынскае абсталяванне.

Тут працуюць высокакваліфікаваныя ўрачы.

НА ЗДЫМКУ: агульны выгляд медыцынскага гарадка.

Фота **А. Перахода.**

Адразу пасля з'езда...

Калі мяне просяць падзяліцца ўражаннямі аб XXII з'ездзе КПСС, я заўсёды ўспамінаю дні, якія папярэднічалі гэтай гістарычнай падзеі ў жыцці нашай краіны, нашай партыі. Нябачаны працоўны энтузіязм, вялікая натхнёная праца на заводах, фабрыках, будоўлях, у калгасах і саўгасах — вось з чым сустракалі з'езд савецкія людзі.

...Наша Баранавіцкая швейная фабрыка. Дзяўчынай прыйшла я сюды ў 1946 годзе, калі фабрыка толькі будавалася. Паўставала яна на маіх вачах. Расла і я разам з ёю. Была будаўнікам, швачкай, зараз — зменны майстар. У 1958 годзе мяне прынялі ў рады Камуністычнай партыі.

Ніколі не забуду верасень гэтага года. У сталіцы нашай рэспублікі Мінску праходзіў XXV з'езд камуністаў Беларусі, у рабоце якога я прымала ўдзел. Мне быў аказаны вялікі гонар: я была абрана дэлегатам XXII з'езда КПСС. Гэты вялікі гонар быў аказаны не толькі мне, але і ўсяму калектыву фабрыкі. Таму ўсе нашы рабочыя імкнуліся адказаць на гэта натхнёнай працай. Кожны з 157 чалавек маёй змены перавыконваў нормы выпрацоўкі, імкнуўся даваць прадукцыю толькі выдатнай якасці. За добрыя паказчыкі ў працы напярэдадні XXII з'езда КПСС нашай змене прысвоілі званне змены камуністычнай працы.

І вось я, простая беларуская жанчына, дачка калгаснікаў, у Маскве, у Крамлёўскім Палацы з'ездаў! Разам з пяццю тысячамі іншых дэлегатаў удзельнічаю ў вырашэнні важнейшых задач нашага часу! Затаіўшы дыханне слухала я даклады М. С. Хрушчова аб рабоце Цэнтральнага Камітэта партыі ў перыяд з XX да XXII з'езда, аб праекце Праграмы КПСС. Сэрца перапаўнялася радасцю за савецкіх людзей. Кожнае ж слова Праграмы — гэта клопаты аб нашым простым чалавеку.

Камуністычная партыя паставіла задачу сусветна-гістарычнага значэння — **забяспечыць у Савецкім Саюзе самы высокі жыццёвы ўзровень у параўнанні з любой капіталістычнай краінай.** Кожная савецкая сям'я атрымае добраўпарадкаваную кватэру, прычым, карыстанне жыллём, як і карыстанне транспартам, кіно, тэатрамі і г. д. у нас будзе бясплатным. Ужо на працягу першых дзесяці год мы пяройдзем на шасцігадзінны рабочы дзень. У нашай краіне будзе самы кароткі рабочы тыдзень. Гэта дасць магчымасць працоўным павышаць свой культурна-тэхнічны ўзровень. Паступова будуць павялічвацца водпускі рабочым, будуць будавацца новыя дзіцячыя сады, яслі, школы, інтэрнаты з бясплатным утрыманнем дзяцей. **«Упершыню ў гісторыі,** — сказаў М. С. Хрушчоў, — **поўнасцю і канчаткова ліквідуецца малазабяспечанасць людзей. Усе савецкія людзі змогуць у дастатку набываць прадметы шырокага ўжытку».**

Вольга ВАСІЛЕВІЧ,
зменны майстар цэха № 1 Баранавіцкай швейнай фабрыкі, дэлегат XXII з'езда КПСС.

В. Васілевіч.

Цяжка пералічыць усё, што намечана з'ездам, Праграмай, якую сапраўды можна назваць маніфестам нашай эпохі. Яе горача адобрылі ўсе дэлегаты з'езда, увесь наш народ. Горача віншавалі з'езд і пасланцы 80 брацкіх камуністычных і рабочых партый. Яны гаварылі аб вялікіх поспехах, дасягнутых нашым народам, аб тым, што камуністычная партыя Савецкай краіны служыць у іх дзейнасці компасам і пуцяводнай зоркай. Яны гаварылі, што Праграма нашай партыі ўсхвалявала ўсё прагрэсіўнае чалавецтва.

...У адзін з дзён работы з'езда ў прэзідыум на маё імя прышла тэлеграма з Баранавіч. Мае сябры-швейнікі паведамлялі, што яны высока трымаюць працоўны сцяг, асвойваюць новыя фасоны, кожны дзень перавыконваюць план, паляпшаюць якасць выпускаемай прадукцыі. І якая я была шчаслівая, калі даведалася, што маёй змене ў гэтыя гістарычныя дні прысвоена імя XXII з'езда КПСС!

Цяжка перадаць словамі, колькі бадзёрасці, сілы і энергіі даў кожнаму з нас гэты гістарычны форум камуністаў. Вось дзе крыніца сапраўднага вялікага натхнення!

У нас, працоўных вялікай Савецкай краіны, так ужо вядзецца: сёння праграма, план, а заўтра — здзяйсненне. Адразу пасля з'езда працоўныя нашай краіны прыступілі да выканання намечанай Праграмы. Узяць хоць бы нашы Баранавічы.

Партыя паставіла задачу вырашыць самую вострую праблему — жыллёвую. У горадзе закладваюцца новыя падмуркі, павялічваецца лік будуемых жылых аб'ектаў.

Партыя паставіла задачу павялічыць вытворчасць тавараў народнага ўжытку, і кожнае прадпрыемства нашага горада — швейная, абутковая, трыкатажная і іншыя фабрыкі — даюць звышпланавай прадукцыі на сотні тысяч рублёў.

Партыя сказала: камунізм — гэта новыя вялікія фабрыкі і заводы, шахты і домны... На ўскраіне нашага горада расце новае вялікае прадпрыемства — баваўняны камбінат.

Адной з важнейшых задач будаўніцтва камуністычнага грамадства з'яўляецца забеспячэнне шчаслівага дзяцінства кожнаму дзіцяці. І ў нашым горадзе будуюцца дзіцячыя ўстановы: сады, яслі, школы, ствараюцца секцыі і гурткі.

У Праграме КПСС запісана: **сацыялістычная дзяржава — адзіная дзяржава, якая бярэ на сябе клопаты аб ахове і няспынным паляпшэнні здароўя ўсяго насельніцтва.** Гэта сапраўды так. У нашай краіне бясплатнае лячэнне, для працоўных — першакласныя кансультацыі, клінікі, санаторыі, дамы адпачынку. А ў бліжэйшыя гады намечана павялічыць водпускі, паступова перайсці да бясплатнага забеспячэння медыкаментамі, санаторыямі, пансіянатамі, турысцкімі базамі і г. д.

Камунізм — гэта новыя людзі, новыя прыгожыя адносіны паміж імі. Гэтыя адносіны складваюцца ўжо сёння. Нядаўна ў нашым цэху па хваробе не вышла на работу некалькі чалавек. Але іх рабочыя месцы не пуставалі. Сюды прышлі лепшыя работніцы. Яны працавалі і за сябе і за хворага таварыша, працавалі з падвоенай энергіяй. І змена не толькі выканала дзённую норму выпрацоўкі, але і перавыканала яе. А вечарам работніцы пайшлі да хворых дамоў. Яны прыбіралі ў пакоях, даглядалі малых дзяцей, рыхтавалі вячэру, правяралі, як школьнікі падрыхтаваліся да заняткаў. Вось яны, новыя, камуністычныя адносіны!

Усе мы добра разумеем, што камунізм не прыдзе сам па сабе. Кожны з нас павінен укласці ў гэтую высакародную справу сваю працу, розум і веды, каб з поўным правам можна было сказаць: тут ёсць і мой уклад. Таму работнікі ўсіх 32 участкаў нашай фабрыкі, добра вывучыўшы задачы, пастаўленыя партыяй, вызначылі сваё месца ў будаўніцтве новага грамадства.

Камунізм — гэта недалёкае будучае. Наша партыя ўрачыста абвясціла: **цяперашняе пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пры камунізме.** Велічны будынак камунізма будуецца. Ствараюць яго такія цудоўныя людзі, як дзяўчаты з нашай фабрыкі Паліна Жук і Валя Паўлючэнкава, Люба Капцэвіч і Валя Кудзіна, Галя Галкоўская і мільёны іншых савецкіх працаўнікоў. Гэта яны сваёй натхнёнай працай набліжаюць светлае заўтра.

ПРАВЕРАНЫ ШЛЯХ

КАЛГАСНЫ ЛАД — НЕАД'ЕМНАЯ ЧАСТКА САВЕЦКАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГРАМАДСТВА. ГЭТА НАМЕЧАНЫ УЛ. І. ЛЕНІНЫМ, ГІСТАРЫЧНА ПРАВЕРАНЫ, АДПАВЯДАЮЧЫ АСАБЛІВАСЦЯМ СЯЛЯНСТВА ШЛЯХ ЯГО ПАСТУПОВАГА ПЕРАХОДУ ДА КАМУНІЗМА.

КАЛГАСНАЯ ФОРМА ЦАЛКАМ АДПАВЯДАЕ ЎЗРОЎНЮ І ПАТРЭБАМ РАЗВІЦЦЯ СУЧАСНЫХ ВЫТВОРЧЫХ СІЛ У ВЕСЦЫ, ДАЗВАЛЯЕ ЭФЕКТЫЎНА ЎЖЫВАЦЬ НОВУЮ ТЭХНІКУ І ДАСЯГНЕННІ НАВУКІ, РАЦЫЯНАЛЬНА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ РЭСУРСЫ. КАЛГАС СПАЛУЧАЕ АСАБІСТЫЯ ІНТАРЭСЫ СЯЛЯН З ГРАМАДСКІМІ, АГУЛЬНАНАРОДНЫМІ ІНТАРЭСАМІ, ІНДЫВІДУАЛЬНУЮ І КАЛЕКТЫЎНУЮ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ У ВЫНІКАХ ВЫТВОРЧАСЦІ, АДКРЫВАЕ ШЫРОКІЯ МАГЧЫМАСЦІ ПАВЫШЭННЯ ПРЫБЫТКАЎ І ДАБРАБЫТУ СЯЛЯН НА АСНОВЕ РОСТУ ПРАДУКЦЫЙНАСЦІ ІХ ПРАЦЫ.

(З Праграмы КПСС)

ГЭТУ гісторыю нам расказалі ў Паставах. Непасрэднае дачыненне да яе маюць толькі два чалавекі — сакратар партыйнай арганізацыі калгаса «Шлях да камунізма» Пастаўскага раёна Анатолій Антонавіч Курдзёнак і яго колішні неразлучны друг і прыяцель, беларускі аргенцінец Веніямін Ластоўскі. Дваццаць тры гады таму назад яны разам бадзяліся па Лацінскай Амерыцы ў пошуках работы. Цяпер іх раздзяляе акіян. Аднак ёсць нешта такое, што да гэтага часу нябачнымі ніцямі звязвае былых сяброў, напаўняе іх сэрцы надзеяй на новыя, на гэты раз больш радасныя сустрэчы.

Анатолій Антонавіч Курдзёнак, вярнуўшыся на Радзіму, знайшоў сваё шчасце ў мірнай



Партыйнаму важаку калгаса трэба быць у курсе ўсіх падзей. Памятаючы аб гэтым, Анатолій Антонавіч Курдзёнак за апошнія гады прачытаў многа мастацкай і палітычнай літаратуры. У яго асабістай бібліятэцы ўжо налічваецца 150 кніг. Днямі ён набыў новую партыю літаратуры. НА ЗДЫМКУ: Анатолій Антонавіч праглядае новы зборнік апавяданняў беларускіх пісьменнікаў.

стваральнай працы на карысць роднага калгаса. Аднавяскоўцы паважаюць яго за кемлівасць і ветлівыя адносіны да людзей. Нездарма ж камуністы калгаса летась аднагалосна абралі яго сакратаром сваёй арганізацыі. Анатолій Антонавіч — добры арганізатар. Ён доўгі час працаваў старшынёй калгаса, вывеў яго ў лік перадавых на Пастаўшчыне па ўраджайнасці збожжавых культур і жывёлагадоўлі. І цяпер, выконваючы абавязкі сакратара партыйнай арганізацыі, ён не грэбуе і чарнавой работай. На рахунку Анатолія Антонавіча не менш працадзён, чым у астатніх калгаснікаў. На пытанне, дзе ён працуе, людзі не без гонару за свайго партыйнага важака адказваюць: «Там, дзе нам найцяжэй даводзіцца наладжваць парадак, — на жывёлагадоўчых фермах...».

Многія беларусы за рубяжом ужо сёе-тое чулі пра гэтага непаседлівага чалавека. Яшчэ ў 1959 годзе ён выступаў у нашай газеце з артыкулам «Не забывайцеся аб Радзіме». Анатолій Антонавіч тады паведамляў сваім знаёмым у Аргенціне, што, вярнуўшыся дадому, ён упершыню за сваё нядоўгае, але гаротнае ў мінулым жыццё адчуў сябе чалавекам. Аднавяскоўцы сустрэлі яго ветліва, дапамаглі адбудавацца. Потым, калі ў Целяках арганізаваўся калгас, выбралі старшынёй праўлення.

Першым адгукнуўся на гэты артыкул Веніямін Ластоўскі. «Шчаслівы ты чалавек, пісаў ён у сваім лісце Курдзёнку, Радзіма ўзвысіла цябе, бо ты, вярнуўшыся з Аргенціны, быў заадно са сваімі аднавяскоўцамі, разам з імі змагаўся супраць фашысцкіх захопнікаў, а цяпер мацуеш родны калгас. А я і рад бы ў рай, ды грахі не пускаюць. Мне ж пераваліла ўжо на шосты дзесятак, дык вось сяджу і думаю: каму я цяпер патрэбны на Радзіме?»

Анатолія Антонавіча моцна ўсхваляваў гэты ліст. Ён некалькі разоў уголас прачытаў яго сваім сябрам у калгасе, раіўся з імі, чым можна дапамагчы Ластоўскаму ў яго сумным адзінокім жыцці ў далёкай Аргенціне.

Веніямін, як і Анатолій Антонавіч Курдзёнак, калісьці гадаваўся на Пастаўшчыне ў беднай сялянскай сям'і і таму ледзь не з самай калыскі марыў аб уласным кавалку зямлі. Але на шляху да гэтай мары стаяла многа перашкод. Панскі лад менш за ўсё дбаў аб дабрабыце сялян. Амаль 75 працэнтаў зямельных угоддзяў належалі мясцовым памешчыкам і капіталістам. А сапраўдныя гаспадары гэтага цудоўнага па сваёй неапісальнай прыгажосці кутка нашай Радзімы — беларускія сяляне — гібелі ў нястачы.

Каб не памерці ад голаду, Веніямін Ластоўскі наймаўся на сезонныя работы да польскіх асаднікаў. Потым яго пацягнулі да сябе нязведаныя далі. На Пастаўшчыну ж якраз прыехалі вярбоўшчыкі з Аргенціны, і малады малапісьменны хлебароб не ўстаяў перад іх абяцанкамі, паехаў зарабляць грошы ў гэтую тады яшчэ мала абжытую краіну. Аргенціна ў яго юнацкім уяўленні была раем для перасяленцаў. Вярбоўшчыкі кляліся, што там кожны эмігрант можа лёгка нажыць сабе багатую ферму. У даведніках, разлічаных на вясковых прастачкоў, чорным па беламу было напісана, што карэнныя жыхары Аргенціны мала дбаюць аб зямлі. Пераважная большасць з іх — каўбоі, якія ўмеюць толькі гарцаваць на конях і страляцца за прыгожых жанчын.

Але гэта была звычайная прапагандысцкая хлусня. Яшчэ па дарозе ў Буэнас-Айрэс Веніямін Ластоўскі пераканаўся, як жорстка ашукалі яго вярбоўшчыкі. Сярод пасажыраў парахода, на якім ён ехаў у Аргенціну, былі старыя эмігранты. Яны прыязджалі на Радзіму па свае сем'і і на зваротным шляху расказалі маладому перасяленцу ўсю праўду аб жыцці ў Аргенціне. Зямлі там сапраўды было многа, але гаспадарылі на ёй капіталістычныя манаполіі. А на долю перасяленцаў заставалася адно — батрачыць, гнуць спіну на такіх жа паноў, як і ў Польшчы.

На сваім горкім вопыце пераканаўся ў гэтым і Анатолій Антонавіч Курдзёнак, які ўслед за сваім земляком Веніямінам Ластоўскім таксама трапіў у Аргенціну. Сябры доўга бадзяліся там без работы, не маглі знайсці сабе надзейнага прытулку.

У кожнага чалавека ёсць свая запаветная мара. І незалежна ад таго, вялікая яна ці малая, жыццё будзе невясёлым, пустым, калі яна не збудзецца. А слабыя, моцна змардаваныя і прыніжаныя жыццёвымі нягодамі людзі разам з апошнімі сіламі часам трацяць і годнасць сваю.

У Курдзёнка і Ластоўскага былі добрыя сябры. У дружбе з простымі аргенцінцамі — рабочымі капіталістычных прамысловых прадпрыемстваў і буйных памешчыцкіх гаспадарак (эстансій) чэрпалі яны новыя сілы. Менавіта там, у Аргенціне, Анатолій Антонавіч Курдзёнак упершыню жыва зацікавіўся рэвалюцыйнай дзейнасцю камуністаў. Шчыра спачуваў ім тады і Веніямін Ластоўскі, хоць, як кажуць, больш думаў аб заработках. Марксісцкай літаратуры сябры не чыталі, у палітыку асабліва не лезлі, аднак там, дзе гэта неабходна было, рашуча падтрымлівалі кожны добры пачын мясцовых рэвалюцыянераў.

У 1939 годзе іх дарогі разышліся. Ластоўскі ўладкаваўся на работу на якімсьці тэкстыльным прадпрыемстве з надзеяй, што нарэшце крыху абжывецца, пабагацее, а Курдзёнак прадаў усё сваё дабро, сабраў грошы на дарогу і заспяшаўся дадому.

— Я ўпэўнены, што і ты неўзабаве прыедзеш, — гаварыў ён на развітанне Ластоўскаму.— Галоўнае, не падай духам. Панскі лад, думаецца мне, ужо дажывае апошнія дні на нашай радзіме.

Аднак Веніямін Ластоўскі ўсё ж застаўся ў Аргенціне. Відаць, у яго былі іншыя планы. Тады ж мала хто з эмігрантаў верыў, што на Радзіме ім будзе лепш. А цяпер чалавек сохне ад думак і не ведае, што рабіць. Веніямін ужо і свайму сябру Курдзёнку не верыць. У апошніх пісьмах на Радзіму ён са згрызотай пытае: а чаго дамогся Анатолій? Наўрад ці ён задаволены сваім лёсам.

Анатолій Антонавіч Курдзёнак стаў чалавекам, актыўным будаўніком камунізма. І ў гэтым, як ён сам кажа, яго сапраўднае шчасце.

...Прыгожая сёлета восень стаяла на Пастаўшчыне. Калгаснікі сельгасарцелі «Шлях да камунізма» па праву называюць яе залатой. Вясной і летам яны слаўна папрацавалі на палях і цяпер ледзь спраўляюцца з ураджаем.

— Усе збожжавыя і тэхнічныя культуры мы ўбіралі машынамі, — расказвае Анатолій Антонавіч. Старшыня калгаса якраз у адпачынку, дык ён замяшчае яго. Задача гэта нялёгкая, аднак Анатолій Антонавіч усюды паспявае.

— Праз які тыдзень, — з упэўненасцю гаворыць ён, — мы і ў кладавых навядзём парадак. Трэба ж ачысціць і засыпаць у засекі насенне пад ураджай будучага года.

Простымі, няхітрымі словамі малюе гэты, цяпер ужо сівы, умудроны вопытам беларускі хлебароб будні свайго калгаса, поспехі, атрыманыя на палях, фермах, называе перадавікоў, камуністаў і беспартыйных калгаснікаў — Мікалая Дзіковіча, Сігізмунда Савіцкага, Пятра Валодзьку, Антона Аляхновіча, Станіслава Бянькоўскага, Франца Сяменаса. Разам з гэтымі працалюбівымі калгаснікамі ён цяпер змагаецца за далейшае развіццё грамадскай гаспадаркі. І не толькі ў Целяках, а ва ўсіх адзінаццаці вёсках, якія ўваходзяць у калгас. І ніхто з гэтых былых гарапашнікаў цяпер не крыўдуе на недахоп зямлі. Актам на вечнае карыстанне за сельгасарцеллю «Шлях да камунізма» на 315 двароў замацавана 3.548 гектараў ворыва і сенакосу. Частка гэтых угоддзяў была забалочана. Але калгаснікі агульнымі сіламі асушылі іх, і цяпер на шырокіх арцельных палях усюды задорна грукочуць трактары.

На Пастаўшчыне крыху халадней, чым у паўднёвых раёнах Беларусі — у Брэсцкай і Гомельскай абласцях. Тут часцей выпадаюць праліўныя дажджы, больш неабжытых азёр і лясоў. Гэта наклала свой адбітак і на сельскую гаспадарку. Большасць калгасаў Пастаўшчыны — жывёлагадоўчыя. Аднак тут не забываюцца і на такія галіны вытворчасці, як ільнаводства, агародніцтва, паўсямесна закладаюцца сады, добраўпарадкоўваецца рыбная гаспадарка.

У калгасе «Шлях да камунізма», апрача ўсяго гэтага, паспяхова развіваецца і гадоўля птушак. Пакуль яна яшчэ вялікіх прыбыткаў не дае. Справа гэта новая, патрабуе разумнага размеркавання сіл і набыцця адпаведных навыкаў, але і тут ужо бачны прыкметныя зрухі.

— Наша арцель поўнасцю забяспечана тэхнікай, — тлумачыць Анатолій Антонавіч. — Не крыўдуем мы, як гэта раней было, і на нястачу электраэнергіі. На цэнтральнай сядзібе калгаса і ў брыгадах устаноўлены магутныя электраматоры. Значыць, спакойна можна планаваць любое мерапрыемства па закладцы новых птушкаферм і забеспячэнню іх кармамі. Дзякуючы добра пастаўленай жывёлагадоўлі і прамысловаму ільнаводству, мы кожны год атрымліваем высокія прыбыткі. Пастараемся, каб і ад птушак была карысць.

Карысць будзе. Камуністы калгаса пад сваю адказнасць узялі гэту справу. Ды каб толькі гэта! На кожным участку работы адчуваецца іх гаспадарлівае вока. За апошнія гады ў Целяках па іх ініцыятыве пабудаваны новая школа-сямігодка, сельскі клуб, магазін, гараж на 8 грузавікоў і адну легкавую машыну, абсталявана паветка для 16 трактараў і двух камбайнаў, перасыпаны і значна пашыраны жывёлагадоўчыя фермы.

— Жывём, як бачыце, нішто сабе, — шчыра радуецца Курдзёнак. — Я, прыкладна, калісьці і не сніў пра такое прыгожае і цікавае жыццё. А цяпер, можна сказаць, на дваццаць гадоў наперад бачу, як і што ў нашых Целяках будзе. Аб гэтым усё ў новай Праграме Камуністычнай партыі Савецкага Саюза сказана. Абапіраючыся на яе, мы ператворым наш край, зробім яго яшчэ больш багатым і гасцінным. Мой зямляк Веніямін Ластоўскі не пазнае родных мясцін, калі прыедзе на Пастаўшчыну ў госці. Так і напішыце яму ад майго імя: не забывайся на сваю Бацькаўшчыну, дружа! Прыедзеш — сустрэнем, як роднага. Калі тыя пісьмы, што я пісаў табе і іншым сваім сябрам у Аргенціну, не дайшлі да цябе, дык хоць па радыё паслухай, як мы цяпер заможна і культурна жывём. Не гора і бяда, а звонкія песні спадарожнічаюць нам.

І сапраўды, звонка і радасна спяваюць сёння і ў гэтым прывольным кутку неабсяжнай Савецкай Радзімы. Спяваюць, бо кожнаму хочацца расказаць аб сваёй шчаслівай вольнай долі, аб сонечнай радасці новага жыцця.

А. БУДЗЕЙКА.

Калгас «Шлях да камунізма», Пастаўскі раён.



Раённы Дом культуры ў г. Паставы.

На занятках у Целякоўскай сямігадовай школе.

Толькі ад жывёлагадоўлі калгас «Шлях да камунізма» сёлета атрымаў 150 тысяч рублёў прыбытку ў пераліку на новыя грошы. Зараз на фермах гэтай сельгасарцелі налічваецца 815 галоў буйнай рагатай жывёлы, 837 свіней і 160 авечак. Уся жывёла ўтрымліваецца ў добра абсталяваных тыпавых памяшканнях. На здымку: новы кароўнік для дойнага статку арцелі.

ЭКСПАНУЕ САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

Шматлікімі рознакаляровымі ўмоўнымі абазначэннямі спярэшчана вялікая карта Савецкай Беларусі. Яна, як захапляючая кніга, расказвае пра індустрыяльны росквіт пасляваеннай Беларусі. Прадпрыемствы 14-ці важнейшых галін прамысловасці выпускаюць самую разнастайную прадукцыю — ад магутных 25- і 40-тонных самазвалаў і аўтаматычных ліній да швейных і патэфонных іголак. Толькі адных станкоў дае сёння беларуская прамысловасць 10,7 працэнта агульнасаюзнай вытворчасці. Амаль кожны сёмы трактар, што выпускаецца ў СССР, носіць марку Мінскага завода. На прадпрыемствах БССР вырабляецца 13,5 працэнта ўсяго шкла, што выпускаецца ў краіне, 40 працэнтаў пенашкла. Рэспубліка стала адзіным у краіне пастаўшчыком тэрмастойкіх труб. У дзесяткі краін свету экспартуецца прадукцыя беларускіх заводаў.

Каля карты прамысловасці рэспублікі нашу ўвагу прыцягнуў немалады чалавек у ваенным кіцелі без пагон. Ён доўга стаяў і разглядаў абазначэнні на ёй, здзіўлена ківаў галавой, а затым выцягнуў блакнот і пачаў рабіць запісы. Гэта аказаўся былы ваенны, штурман аднаго з падраздзяленняў авіяцыі разведчыкаў В. Воранаў.

— Колькі тут знаёмых месц! — сказаў ён. — Толькі інакш выглядалі яны на карце ў маім планшэце ў гады вайны. Часта даводзілася мне ў тыя часы пралятаць над Беларуссю. Бывала, глядзіш зверху, фатаграфуеш, і сэрца ад болю сціскаецца — усюды разбураныя гарады і сёлы, усюды руіны і пажарышчы... Нават не верылася, што ўсё гэта можна так хутка аднавіць. А вось змаглі... малайцы!..

Захапленне ў адрас беларусаў можна пачуць літаральна ля кожнага стэнда, ля кожнага экспаната.

Афарбаваныя ў шэры колер, стаяць у залах станкі. Гэта апошнія навінкі заводаў — Мінскага падшыпнікавага, Віцебскага станкабудаўнічага, шліфавальных і заточных станкоў, Магілёўскага завода імя Кірава і іншых. Побач з імі — прыборы і ўдасканаленні, распрацаваныя лабараторыямі інстытутаў Беларускай Акадэміі навук.

— Тут прадстаўлены толькі адзінкі, — тлумачыць экскурсавод групе замежных турыстаў. — Усе ўзоры прадукцыі беларускай станкабудаўнічай прамысловасці не магчыма змясціць і ў дзесяці такіх павільёнах. Толькі за першыя два гады сямігодкі ў рэспубліцы асвоен выпуск звыш 400 новых відаў станкоў, машын, прыбораў.

— Мы ведаем беларускую прадукцыю не толькі па выгляду, але і па рабоце, — сказаў госць з Румыніі. — Многія цэхі нашых заводаў абсталяваны беларускімі станкамі, па нашых дарогах снуюць беларускія грузавыя аўтамашыны, а палі апрацоўваюць беларускія трактары. Гэта ж сапраўдны цуд — пасля такой разбуральнай вайны за кароткі час стварыць такую магутную прамысловасць.

Так думаюць і так гавораць сотні іншых наведвальнікаў. Іх здзіўленне і захапленне выклікаюць не толькі станкі і механізмы, але і мноства іншых прадметаў, вытворчасць якіх асвоена ў Беларусі. Мінскія радыёпрыёмнікі, тэлевізары, радыёлы. Іх добра ведае савецкі спажывец, іх ахвотна купляюць не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Беларускія матацыклы і веласіпеды, нягледзячы на сваю маладосць, паспелі ўжо заваяваць добрую славу.

Беларускія гадзіннікі, мэбля, посуд, крышталь, пініна, швейныя машыны, газавыя пліты, фотаапараты, вырабы вялікай хіміі, запалкі, папера, галантарэя, абутак...

Багатыя залы, дзе экспануецца прадукцыя сельскай гаспадаркі. Тут відаць вынік перадавога вопыту лепшых гаспадарак рэспублікі ў павышэнні ўраджайнасці палёў і ўзняцці прадукцыйнасці жывёлагадоўлі. Асобныя стэнды знаёмяць са слаўнымі справамі калгасаў «Расія» Гродзенскай вобласці, «Камінтэрн» Магілёўскай вобласці, «Перамога» Віцебскай вобласці, саўгаса «Чырвоная Зорка» Мінскай вобласці і іншых.

Усеагульную ўвагу прыцягвае раздзел, экспанаты якога гавораць аб росквіце мастацтва і літаратуры. Адным з яркіх паказчыкаў росту культуры служаць лічбы кнігавыдання. Толькі ў 1960 годзе ў рэспубліцы выдадзена 1.602 назвы кніг агульным тыражом 14.230 тысяч экземпляраў. Шырокай славай карыстаюцца беларускія артысты, музыканты, пісьменнікі, кнігі якіх перакладаюцца на многія мовы свету.

Нельга не захапляцца і выдатнымі работамі майстроў народнай творчасці, выкананымі з дрэва, саломкі і косці, вытканымі з ільну і шоўку, упрыгожанымі нацыянальнымі арнаментамі.

ВДНГ трапна названа універсітэтам перадавога вопыту. Адным з яго факультэтаў можна назваць павільён Беларускай ССР. Сюды прыходзяць вучыцца, пераймаць вопыт, адсюль выходзяць узбагачаныя перадавымі метадамі працы. Шчодра, ад усяго сэрца раскрываюць «сакрэты» сваіх перамог шліфоўшчык Мінскага падшыпнікавага завода Ф. Алексяевіч, заслужаны рацыяналізатар рэспублікі Л. Свістун, электразваршчык трактарнага завода М. Антонік, старшы майстар Мінскага інструментальнага завода К. Крашчановіч, цялятніца аднаго з калгасаў Мінскай вобласці Я. Бандак і многія іншыя, чыя праца памнажае багацці і ўмацоўвае магутнасць роднай Беларусі, павялічвае яе славу.

Павільён БССР на ВДНГ знаёміць наведвальнікаў не толькі з тым, што дасягнута беларускім народам, што стала рэальнасцю. Шматлікія яго экспанаты і матэрыялы дазваляюць заглянуць у заўтрашні дзень рэспублікі, убачыць яе выдатныя перспектывы. А яны сапраўды велічныя. Беларусь у адзіным страі з усімі брацкімі рэспублікамі краіны Саветаў упэўнена і цвёрда крочыць па светлым шляху, які вядзе яе да камунізма.

Д. СЯМЕНАЎ.

Больш трыццаці відаў новых вырабаў з крышталю, накладнога і бескаляровага шкла асвоена ў гэтым годзе на шклозаводзе «Нёман». На здымку: мастакі завода абмяркоўваюць узор новага сувеніра.

Дарагія сябры! Кожны дзень мы слухалі перадачы з Масквы. Словы праўды, якія ішлі з Крамля, дзе праходзіў XXII з'езд КПСС, знаходзілі водгук у сэрцы кожнага суайчынніка. Мы з радасцю даведаліся, што Савецкая дзяржава нястомна клапоціцца аб побыце кожнага чалавека, аб паляпшэнні арганізацыі народнай адукацыі, пашырэнні сеткі навучальных устаноў і г. д.

Нядаўна свет быў узрушаны выдатнымі палётамі першых касманаўтаў Гагарына і Цітова. І як сімвалічна, што гэты подзвіг зрабілі савецкія людзі.

Перад савецкім народам стаіць вялікая і высакародная мэта — пабудова камунізма.

Жадаю вялікіх поспехаў савецкім людзям.

П. БЕЛАЯ.

ФРГ.

* * *

Мне пашчасцілася на працягу некалькіх дзён слухаць з Масквы радыёперадачу матэрыялаў XXII з'езда партыі. Даклады М. С. Хрушчова запалі ў душу і ўсялілі глыбокую веру ў шчаслівае жыццё савецкіх людзей у камуністычным грамадстве, якое яны будуюць, сцвярджаючы на зямлі Мір, Працу, Свабоду, Роўнасць, Брацтва і Шчасце ўсіх народаў.

Нас на чужыне натхняюць гіганцкія справы і планы нашай Радзімы, праца савецкіх людзей служыць нам прыкладам.

Мы ганарымся тым, што наш народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна пракладвае шлях наперад — да камунізма!

А. КАРНАЎХАЎ.

Ліван.

АСАМБЛЕЯ ПРАЦОЎНЫХ УСЯГО СВЕТУ

МАСКВА. Актуальнейшыя праблемы міжнароднага рабочага руху абмеркаваў V Сусветны кангрэс прафсаюзаў, які адбыўся ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў. З яго высокай трыбуны гучалі заклікі няспынна мацаваць міжнародную салідарнасць працоўных, іх адзінства ў барацьбе за мір, супраць пагрозы новай вайны, у абарону жыццёвых інтарэсаў.

На кангрэсе выступалі дэлегаты, якія прыбылі з усіх кантынентаў зямнога шара. Адзначаючы растучую сілу Сусветнай федэрацыі прафсаюзаў, прамоўцы высунулі рад задач, звязаных з далейшым развіццём рабочага руху, заваяваннем працоўнымі сацыяльных правоў, патрабавалі ліквідацыі рэшткаў другой сусветнай вайны і канчатковага знішчэння ганебнай каланіяльнай сістэмы.

Многія выступаючыя асудзілі дзеянні імперыялістаў ЗША — галоўных ворагаў міру і супрацоўніцтва паміж народамі, рэзка крытыкавалі правых прафсаюзных дзеячоў, якія стаяць на чале так званай міжнароднай канфедэрацыі свабодных прафсаюзаў.

Страшную карціну дэспатызму амерыканскай ваеншчыны і нгодзіньдзьемаўскага тэрору ў Паўднёвым В'етнаме намаляваў у сваім выступленні Нгуен Ван Там — член выканкома Асацыяцыі працоўных за вызваленне Паўднёвага В'етнама. Груба парушыўшы Жэнеўскае пагадненне, амерыканскія імперыялісты з дапамогай свайго стаўленіка Нго Дзінь Дзьема ператварылі гэтую частку краіны ў сваю ваенную базу. Паўднёвы В'етнам даведзены да крайняй ступені спусташэння. Тут усё падначалена вайне. Усюды лютуюць агонь, катаванні, пакаранні смерцю, усюды можна бачыць слёзы і бясконцае людское гора.

Але народ Паўднёвага В'етнама, заявіў прамоўца, ніколі не схіліць галавы перад чужаземнымі прыгнятальнікамі. Прафсаюзныя арганізацыі мабілізуюць працоўных на барацьбу супраць захопнікаў і іх нахлебнікаў. Рашэнні гэтага кангрэсу, сказаў у заключэнне Нгуен Ван Там, акажуць вялікі ўплыў на развіццё сусветнага прафсаюзнага руху. Яны дапамогуць працоўным Паўднёвага В'етнама ў іх далейшай барацьбе за свабоду і шчасце.

У зале раздаецца бура апладысментаў, калі старшынствуючы прадастаўляе слова герою космасу Г. С. Цітову. Дэлегаты кангрэсу ўстаюць і горача вітаюць слаўнага сына вялікага савецкага народа.

Г. С. Цітоў перадае дэлегатам і гасцям Сусветнага кангрэсу прафсаюзаў, прадстаўнікам шматмільённай арміі працоўных братняе прывітанне.

Я бачыў нашу Зямлю з космасу, гаворыць ён. Гэта было цудоўнае і незабыўнае відовішча. Касмічны карабель «Усход-2», напамінае Цітоў, нёс на сваім борце не атамную бомбу, не якую-небудзь іншую смяротную зброю. Савецкія касмічныя караблі зрабілі палёты ў прасторах космасу як вестуны міру і дружбы народаў.

Нагадаўшы, што сіла працоўных усяго свету заключана ў іх згуртаванасці і адзінстве, Г. С. Цітоў сказаў: дык будзем жа разам змагацца за тое, каб ніколі смерч вайны не змог знявечыць цудоўнае аблічча Зямлі. Савецкія касманаўты ад душы жадаюць паспяховай і плённай работы магутнаму форуму прадстаўнікоў працоўных усяго свету.

У зале зноў грымяць авацыі.

Старшынствуючы Лю Чан-шэн — віцэ-старшыня ВФП, намеснік старшыні Усекітайскай федэрацыі прафсаюзаў адзначае, што палёты савецкіх касманаўтаў яшчэ раз даказваюць перавагу сацыялістычнага ладу. Я думаю, гаворыць ён, што выкажу пачуццё кожнага з нас, калі падзякую Герману Цітову за прывітанне, перададзенае ім кангрэсу.

Велізарныя змены адбываюцца на афрыканскім кантыненце. Аб іх гаварылі на кангрэсе многія прамоўцы, у тым ліку генеральны сакратар Нацыянальнага саюза працоўных Маўрытаніі Жан Сао. Разам з тым ён адзначыў, што некаторым краінам Афрыкі прадастаўлена ўяўная незалежнасць, а камандныя вышыні па-ранейшаму займаюць прадстаўнікі каланіяльных дзяржаў. Не дзіўна таму, што, напрыклад, у Маўрытаніі французскі каланіялізм меў магчымасць увесці надзвычайныя законы супраць дэмакратычных арганізацый і, у прыватнасці, супраць нацыянальнага аб'яднання прафсаюзаў — найбольш аўтарытэтнай рабочай арганізацыі Маўрытаніі. Жан Сао выказвае ўпэўненасць, што працоўныя Афрыкі даб'юцца поўнага вызвалення ад ланцугоў каланіялізму.

Старшыня Нацыянальнай федэрацыі транспартных служачых Новай Зеландыі Ліэл Саутан указаў, што прафсаюзны рух у яго краіне прадстаўляе зараз унушальную сілу.

Вялікую шкоду справе міру і адзінства прафсаюзнага руху, заяўляе прамоўца, наносяць хлусня і буржуазная прапаганда, якія распаўсюджваюцца па ўсім свеце друк імперыялістычных манаполій. Прафсаюзы павінны ўзмацніць контрпрапаганду, правільна інфарміраваць народы аб становішчы спраў у свеце.

Выступіўшы ад імя членаў Міжнароднага аб'яднання прафсаюзаў лясной і будаўнічай прамысловасці і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, Вейка Паркала на вялікім фактычным матэрыяле паказвае, як пастаянна растуць прыбылі капіталістаў і пагаршаецца становішча працоўных.

Аб дэспатызме, які пануе ў Іране, расказвае генеральны сакратар цэнтральнага савета аб'яднаных прафсаюзаў Ірана Рэза Руста. Амерыканаанглійскі імперыялізм ператварыў Іран у каланіяльную краіну, у ачаг інтрыг і правакацый супраць СССР і ўсяго сацыялістычнага лагера.

Рабочы клас, інтэлігенцыя, усе працоўныя, заяўляе Р. Руста, змагаюцца супраць дыктатарскага рэжыму, за аднаўленне дэмакратычных правоў, за нейтралітэт, за дружбу з СССР. З кожным днём узмацняецца барацьба за выхад Ірана з агрэсіўнага пакта СЕНТА.

Аб размаху дэмакратычнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Лацінскай Амерыцы гаворыць у сваім выступленні генеральны сакратар Федэрацыі прафсаюзаў будаўнікоў Аргенціны Рубен Іскара. Падзеі апошніх год сведчаць, што лацінаамерыканскі кантынент перастаў быць пасіўным ар'ергардам імперыялізму. Шырыцца барацьба народаў супраць капіталістычнага рабства і нацыянальнага прыгнёту.

Прамоўца ўказвае на растучае імкненне працоўных Лацінскай Амерыкі да адзінства. Прынята рашэнне склікаць у наступным годзе лацінаамерыканскую канферэнцыю прафсаюзаў.

На кангрэсе прысутнічалі прадстаўнікі непрафсаюзных міжнародных арганізацый — Міжнароднага бюро працы, Міжнароднай дэмакратычнай федэрацыі жанчын, Міжнароднай асацыяцыі сацыяльнага забеспячэння, Міжнароднай асацыяцыі юрыстаў-дэмакратаў, Сусветнай федэрацыі дэмакратычнай моладзі, Міжнароднага саюза студэнтаў.

На кангрэсе з яркай прамовай выступіў Старшыня Савета Міністраў СССР Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў. Яго прамова была выслухана з вялікай увагай і неаднаразова перапынялася бурнымі апладысментамі.

Тэкст прамовы будзе надрукаваны ў наступным нумары нашай газеты.

ПАСЛЯ ПРАЦОЎНАГА ДНЯ...

Вёска Суткоў, што ў Лоеўскім раёне Гомельскай вобласці — цэнтр саўгаса «Дняпроўскі». У маляўнічай мясціне, на правым беразе Дняпра стаіць сярэдняя школа, працуюць электрастанцыя, бальніца, паштовае аддзяленне сувязі, дзіцячыя яслі, ёсць некалькі магазінаў, чайная, Дом культуры. У вёсцы з'явіліся людзі розных прафесій — трактарысты, камбайнёры, настаўнікі, аграномы, медыцынскія работнікі.

Калі на зямлю апускаецца змрок, у клубе ярка запальваюцца электрычныя агні. Калгаснікі спяшаюцца на агонёк у свой клуб, каб весела і цікава правесці вольны час. Да паслуг рабочых ёсць тэлевізійная зала, пакой для гульняў, більярдная, чытальная зала. Ёсць таксама гурткоўны пакой і глядзельная зала на 210 месц.

Пры Доме культуры працуюць харавы, драматычны і танцавальны гурткі. Пад кіраўніцтвам настаўніка Міхаіла Калеснікава самадзейныя артысты дабіваюцца добрых поспехаў. Яны выязджалі з цікавымі канцэртамі на абласны агляд мастацкай самадзейнасці, у раённы цэнтр, неаднаразова выступалі ў клубах суседніх саўгасаў і калгасаў.

Удзельнікі драматычнага гуртка пад кіраўніцтвам завуча Суткоўскай сярэдняй школы Аляксандра Раманавіча Семянені развучваюць п'есу Анатолія Сафронава «Кухарка», танцоры — новыя беларускія танцы. У рабоце гурткоў мастацкай самадзейнасці актыўны ўдзел прымаюць фельчар Ала Старавойтава, свінарка Марыя Коваль, даяркі Любоў Іваненка, Марыя Ярашэвіч, старшая піянерважатая Тамара Сопат і многія іншыя.

Ул. ЛАПІЦКІ.

На здымках:
1. Выступае саўгасны хор.
2. Салісты хору (справа налева): Ганна Гаўрушчанка, Вера Іваненка, Людміла Труханенка, Маргарыта Некрашэвіч. Акампаніруе Міхаіл Калеснікаў.

* * *

КАЛТУНА Андрэя Максімавіча шукае брат КАЛТУНОЎ Максім Данілавіч 1888 года нараджэння.

Да 1946 года М. Д. Калтуноў атрымліваў ад брата пісьмы з Нью-Порка.

Максім Данілавіч Калтуноў просіць таксама напісаць сваіх далёкіх родзічаў Міраноўскага Мікалая Іосіфавіча і Міраноўскага Касьяна Іосіфавіча, якія жывуць у Злучаных Штатах Амерыкі, і ўсіх, хто што-небудзь ведае аб яго браце.

Максім Данілавіч Калтуноў жыве па адрасу: **Мінск, вул. Карла Лібкнехта, дом 148, кв. 10.**

Самы малады майстар спорту

У апошняе імгненне наляцеў вецярок, і мішэнь крышку змясцілася ўправа. А каб паказаць вынік майстра спорту, Галі патрэбна была мінімум дзевятка. Гэты апошні выстрал рашаў усё...

Галя зняла палец з баявога ўзвода і стомлена закрыла вочы. Трэба было зноў сканцэнтравацца.

Час! У праразь мушкі плаўна ўвайшоў самы цэнтр мішэні. Сухі шчоўкнуў выстрал. І не паспеў яшчэ карэкціроўшчык абазначыць попадання, як суддзя, які назіраў у стэрэатрубу, выкрыкнуў:

— Дзесятка!

Галю сардэчна віншавалі. А яна стаяла, крыху разгубленая, і ад хвалявання не магла сказаць ні слова. 553 ачкі з 600 магчымых, норма майстра спорту і прызавое месца ў першынстве рэспублікі — такі быў яе вынік у першых буйных спаборніцтвах.

Цяпер аб вучаніцы 4-й мінскай школы Галі Іваньковай гавораць: талент! Талент, зразумела. За адзін год прайсці шлях ад навічка да майстра спорту СССР, які прайшла Галя, не кожны можа. Але сам талент без працы мала што значыць. Праца раскрывае талент. Так было і ў Галі.

Мікалай Пятровіч Вавілаў, трэнер Галі Іваньковай, ужо з першых дзён знаёмства заўважыў у сваёй вучаніцы такую рысу характару, як працавітасць. Дзяўчынка праяўляла зайздросную цярплівасць і настойлівасць. Часта назіраючы, з якой упартасцю яна выконвае тое або іншае практыкаванне, Мікалай Пятровіч у думках прадказаў ёй спартыўнае будучае. І не памыліўся. Яго вучаніца ўпэўнена ішла ўперад. А праз год яна не толькі наблізілася да нарматыву майстра, але і пераадолела гэты рубеж.

Цяпер 16-гадовая Галя Іванькова самы малады майстар спорту ў нашай рэспубліцы.

В. ІВАНЧАНКА.

На здымку: Г. Іванькова.

Дружба дзяцей розных краін

У розных кутках нашай Радзімы і ў многіх зарубежных краінах ёсць добрыя, верныя сябры выхаванцаў Бярэзінскага дзіцячага дома. Дзеці рэгулярна перапісваюцца, абменьваюцца значкамі, памятнымі падарункамі.

Нядаўна выхаванцы Бярэзінскага дзіцячага дома пабывалі на злёце піянераў Літвы, удзельнічалі ў турысцкім злёце піянераў Закарпацкай вобласці, здружыліся з піянерамі Малдавіі, Грузіі, РСФСР, Кіргізскай ССР. Адпачываючы ў Артэку, бярэзінскія школьнікі пасябравалі з дзецьмі многіх нацыянальнасцей Савецкага Саюза, з зарубежнымі хлопчыкамі і дзяўчынкамі.

У піянерскім пакоі Бярэзінскага дзіцячага дома маляўніча афармлены куток дружбы народаў, у якім сабрана шмат розных экспанатаў. Тут вымпелы, якія прыслалі школьнікі з Комі АССР, Кіргізіі, Літвы, выхаванцы Нова-Быстранскай школы-інтэрната Закарпацкай вобласці, эмблемы турыстаў Азербайджана, Грузіі, Малдаўскай ССР. А вучні горада Электрагорска Маскоўскай вобласці падарылі бярэзінскім дзецям спецыяльную паходную трыножку. Захоўваецца ў гэтым кутку і прыгожы нацыянальны літоўскі пояс. Ёсць тут значкі германскай моладзі, гербы ўсіх сацыялістычных дзяржаў свету і флагі незалежных краін Афрыкі. Вялікую цікавасць прадстаўляе альбом «Вільнюс у ілюстрацыях» — падарунак літоўскіх дзяцей, кніга фотаздымкаў «На вечныя часы», прысвечаная вызваленню Прагі Савецкай Арміяй у 1945 годзе, якую прыслалі ў Беразіно чэхаславацкія дзеці.

У сваю чаргу выхаванцы Бярэзінскага дзіцячага дома шлюць пасылкі ў многія адрасы, пішуць пісьмы сваім шматлікім сябрам з Чэхаславакіі, ГДР, Кітая, Балгарыі і іншых краін.

П. НЕСЦЯРОВІЧ.

НЕЎМІРУЧЫЯ ПЕСНІ

Да 70-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча

У Ялце, у доме Трэнёва і Паўленкі, адкрыты літаратурны Музей. Там прадстаўлена творчасць пісьменнікаў — рускіх, украінскіх, беларускіх, якія пабывалі ў Крыме, лячыліся там, жылі і працавалі. Асобны стэнд прысвечаны М. Багдановічу. Тысячы людзей з усіх куткоў краіны наведваюць музей, дзе атрымліваюць уяўленне пра нашага паэта, для якога гэты сонечны край стаў апошнім прытулкам. Там ён у суседстве з Горкім, Маякоўскім, Чэхавым, Л. Украінкай прадстаўляе беларускае паэтычнае слова.

Максім Багдановіч.

Творчасць М. Багдановіча застаецца сучаснай і цяпер, яна дапамагае выхоўваць чалавека чыстай душы і высокага інтэлекту.

Чытаючы старонкі яго кнігі, не перастаеш дзівіцца: як мог такі малады чалавек столькі зрабіць, так глыбока пранікнуць у таямніцы творчасці.

Трэба было вельмі любіць свой народ, верыць у яго духоўныя сілы, каб напісаць такія творы, як «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі», «Народ, Беларускі Народ!», «Не блішчыць у час змяркання...», «Зразаюць галіны таполі адну за адной..» і цэлы шэраг іншых вершаў, якія з'яўляюцца выдатнымі паэтычнымі помнікамі эпохі прадчування буйных гістарычных перамен і пераўтварэнняў, лепшымі здабыткамі грамадзянскай паэзіі свайго часу.

Беларусь, твой народ
дачакаецца
Залацістага, яснага дня.
Паглядзі, як усход
разгараецца.
Колькі ў хмарках залётных
агня...



Помнік М. Багдановічу ў Ялце.

Шырокі і прывабны паэтычны свет адкрывае нам паэзія М. Багдановіча. У ім жыве беларускі мужык, які хоча пазбавіцца ад цяжару свайго жыцця, салдат Базыль і весялуха Лявоніха, што прыйшлі з народнай песні, слуцкія ткачыхі, знясіленыя паднявольнай працай, рамантычныя вобразы смелых змагароў супраць уціску і няволі («Максім і Магдалена», «Страцім-Лебедзь»), беларуская дзяўчынка-нянька, у якой так многа чалавечага хараства («У вёсцы»), эмігранты, што і на далёкай чужыне бачаць агні родных берагоў («Эміграцкая песня»), пясняр, які марыць глыбока крануць чалавечыя сэрцы.

Далёка ўперад скіроўваўся погляд паэта, калі ён марыў аб прасторах зямлі, на якой не будзе межаў, ірвоў, тыноў («Мяжы»).

Мара аб шчасці і прыгажосці жыцця звязваецца ў паэта са змаганнем, з грамадскай актыўнасцю чалавека. А паасобныя матывы яго лірыкі — грамадзянскія, філасофскія, інтымныя — складаюць адно паэтычнае цэлае.

Споўнілася семдзесят год з дня нараджэння Максіма Багдановіча. Калі б не заўчасная смерць, колькі паспеў бы ён зрабіць пры шчодрасці свайго таленту і нястомнай працавітасці! Ва ўяўленні сваіх чытачоў паэт застаецца вечна маладым, як маладой застаецца яго паэзія, што пільна ўглядаецца ў жыццё, каб раскрыць яго красу і багацці.

РАДЫЁ

ДЛЯ ЗАХОДНЯЙ ЕУРОПЫ

Слухайце штодзённа нашы радыёперадачы па сярэднееўрапейскаму часу: на сярэдняй хвалі 227 метраў (ці 1 322 кілагерцы) з 6 да 7 гадзін, з 16.00 да 17.00 і з 21.00 да 21.30;

на кароткай хвалі 30,83 метра (ці 9730 кілагерцаў) з 6 да 7 гадзін.

Па нядзелях: на хвалях 30,83 метра і 227 метраў з 6 да 9 гадзін і з 10 да 13 гадзін;

на сярэдняй хвалі 227 метраў з 16.00 да 17.00 і з 21.00 да 21.30.

НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Па нядзелях—ад 8 гадзін да 8 гадзін 30 мінут па сярэднееўрапейскаму часу на хвалі 30,83 метра (ці 9730 кілагерцаў) і на сярэдняй хвалі 227 метраў.

ДЛЯ ЗША І КАНАДЫ

Слухайце штодзённа нашы радыёперадачы па нью-йоркскаму часу з 19.30 да 20.30 на хвалях: 31,04 метра (ці 9665 кілагерцаў), 31,23 метра (ці 9605 кілагерцаў), 41,15 метра (ці 7290 кілагерцаў).

НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Па суботах — ад 20 гадзін да 20 гадзін 30 мінут па нью-йоркскаму часу на кароткіх хвалях: 31,04 метра (ці 9665 кілагерцаў), 31,23 метра (ці 9605 кілагерцаў), 41,15 метра (ці 7290 кілагерцаў).

НАШ АДРАС

Мінск, Ленінскі праспект, 77. Дом друку, пакой № 20. Для пісьмаў: Мінск, паштовая скрынка № 14.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.